# ЗНАЁМЫ АДРАС

«За пяць год вучобы мне часта прыходзілася карыстацца паслугамі паштовага аддзялення. Заусёды здзіулялі прафесійны падыход да чалавека, дзелавітыя парады аператара Яугеніі Іванауны Вінічэк і начальніка аддзялення Марыі Мікалаеуны Шабалінай. Дзякуй ім за гэта».

Так сведчыць адзін са шматлікіх запісау, якія пакінулі выпускнікі універсітэта. Побач з ім—удзячныя запісы вучоных, супрацоунікау.

Паштовае аддзяленне «Мінск-80» існуе усяго пяць год. Яно—равеснік пяцігодкі. Ранен універсітэт абслугоувауся галоупаштамтам. Гэта стварала шэраг нязручнасцей у дастауцы пошты, адпрауленні багатай карэспандэнцыі ВНУ. Аб'ём апошняй штогод складае звыш тысячы заказау.

— Так, наша аддзяленне—равеснік пяцігодкі, — расказвае начальнік пошты Марыя Мікалаеуна, — таму калектыў больш за усё хвалюе тое, з чым мы прыйдзем да фінішу. У завяршальным годзе узялі абавязацельства даць даходу 400 рублёу звыш гадавога плана. У дні падрыхтоукі да XXV з'езда партыі, калі ў краіне кожны дзень гучаць рапарты працоуных перамог, і наш маленькі калектыў рыхтуе свой падарунак. Які ён — не сакрэт. Мы перагледзелі абавязацельства і вырашылі замест 400 рублёу даходу атрымаць 1100. За дзевяць месяцау на гэты рахунак запісана ужо 1000 рублёу. Можна упэунена сказаць, што пяцігодку выканаем у сярэдзіне снежня.

Гэта толькі лічбавыя паказчыкі працы сувязістау універсітэта. Заўважым, што ужо тры гады запар аддзяленне сувязі носіць званне «Калектыў камуністычнай працы».

Штамп гэтай пошты ведаюць тысячы выпускнікоу універсітэта і яшчэ большая колькасць абітурыентау, якім прыйшлося падпісваць на канвертах адрас: «Мінск-80, БДУ, прыёмнай камісіі». Усе гэтыя пісьмы праходзілі праз клапатлівыя рукі аператара Я. І. Вінічэк. Яна — ветэран універсітэцкай пошты, пераможца конкурсау прафесійнага майстэрства, якія праводзяцца па ініцыятыве дырэкцыі галоупаштамта.

— Карэспандэнцыя у нас спецыфічная, — падкрэслівае Яугенія Іванауна. Па-першае, мы атрымліваем усе кантрольныя работы студэнтау завочнага факультэта. Затым—пісьмы замежным студэнтам з Азіі, Афрыкі і Заходняй Еуропы. Толькі за год апрацоуваем каля 5 тысяч каштоуных пісьмау. Асабліваая нагрузка вясной і летам, калі ідуць уступныя экзамены. Характар пошты цалкам фарміруе нашы адносіны да працы, да лёсу кожнага пісьма. Таму прафесійная якасць—наш асноўны арыенцір.

Словы аператара пацвярджаюцца тым, што за пяць год не было выпадку, каб па віне аператарау праводзіуся іск страчанай карэспандэнцыі. Ніводнай скаргі не запісана у адрас працаўнікоу аддзялення.

У час нашай размовы на пошту зайшлі некалькі замежных студэнтау. Было зразумела, што яны восенню прыехалі вучыцца у Савецкі Саюз і, такім чынам, нядауна прыступілі да вывучэння складанай рускай мовы. Але, на наша здзіуленне, агульная мова была знойдзена, і рабяты пайшлі задаволеныя.

Да адкрыцця з'езда роднай партыі засталося некалькі месяцау. У вялікай перадз'ездаускай працоунай вахце займаюць свае месца і сувязісты паштовага аддзялення «Мінск-80».

**М. ШАРШНЁЎ.**

# ПА ПАЎДНЁВАМУ БУГУ

У нашым універсітэце секцыя воднага турызму існуе другі год. У ёй займаюцца студэнты многіх факультэтау. Спачатку яны набываюць навыкі воднага турызму, а потым робяць паходы на байдарках.

У сярэдзіне лістапада студэнты IV і V курсау фізічнага факультэта У. Глумінскі, С. Максіменка, В. Міроненка і А. Піатроускі адправіліся на байдарках па Паудневаму Бугу. Рака гэта для праходжання на байдарках прыроуніваецца да другой катэгорыі складанасці.

У тую раніцу выпау першы снег. Ён падау такімі вялікімі сняжынкамі, што, здавалася, зіма і сапрауды захацела уступіць у свае правы. Міжволі падумалі: сабраліся у асенні паход, а атрымалася, у зімні.

Як ні цяжка было уставаць з цёплай пасцелі, але ужо чакалі туга набітыя рукзакі, упакаваныя байдаркі.

Першым аутобусам прыбылі на вакзал, узялі білеты на поезд, які ішоу да Кіева. Ад Кіева ехалі да станцыі Рудніца, а потым па вузкакалейцы дабраліся да Гайварона. Ніжэй Гайваронскай плаціны і пачаўся байдарачны паход.

Чаму выбралі іменна гэты маршрут? Рабяты кажуць, што ён даволі складаны і цікавы. Павінны былі пераадолець каля 50 перашкод: парогаў і перакатаў.

З гэтай вады сухімі выходзілі вельмі рэдка. Тым больш незразумела нецярплівасць, з якой чакаюць гэтага дня, пераадольваючы шмат адміністрацыйных няувязак, каб нарэшце ўлезці у халодны, мутны паток і праплысці 230 кіламетрау, па магчымасці застаючыся сухімі на працягу сямі дзён.

Думалі, што хоць у пачатку рака будзе добрай і дасць магчымасць «адчуць» ваду. Але першыя ж кіламетры шляху пачаліся з перашкод. Цячэнне несла лодкі наперад, а ззаду заставаліся пазелянелыя ад вады камені.

Першая начоука была прама на беразе. Над кастром сушылі мокрае адзенне. Слухалі радыёпрыёмнік. Ноччу стала холадна. Палатка пакрылася інеем. Сушылі яе гарачымі вуголлямі ад кастра.

Потым працягвалі свой шлях на байдарках. У некаторых месцах рака была спакойнай. Тады разглядвалі берагі і нават фатаграфавалі.

Позняя восень. Ёсць свая непауторная прыгажосць у скал, якія акаймоуваюць раку. Дзе-нідзе растуць на беразе кусты шыпоуніка, яго пурпурныя ягады крануты марозцам. А на завадзях рака пакрыта тонкай ледзяной коркай.

— Ну вось,— расказваюць удзельнікі паходу,— чуецца моцны шум. І раптам — рэзкі перапад, а за ім — каменная града. І хоць мы ведалі аб гэтым, адна з байдарак нахілілася, наляцела на камень і неяк ненатуральна замерла. Аказалася, трэснуу борт лодкі. Магло быць і горш.

Некалькі разоу рабілі абнос старых, пакінутых мельніц і нават ГЭС у Першамайску. А абнос — гэта цягнеш на сабе байду (так любоуна называюць турысты-воднікі свой сродак перамяшчэння), нагружаную мінімум двума рукзакамі.

Некалькі разоу спыняліся на начлег у вёсках, якія знаходзіліся непадалёку ад ракі.

У вёсцы Вялікая Мячэтня начавалі у немаладой жанчыны, якая выгадавала пяцёра дзяцей. Яна хутка сабрала на стол і запрасіла па-украінску:

— Паснедайце, хлопчыкі.

Развесіла прамокшае адзенне ля печы.

Апошнюю ноч пераначавалі ў хаце дзеда, які, як аказалася, шмат ведае аб Беларусі.

Хутка прабеглі дні паходу. Ззаду засталіся Мігейскі каскад, Чырвоныя вароты, дзе рака праходзіць паміж дзвюх скал, парог Гард. Рабяты не шкадуюць, што качанелі рукі і пальцы немагчыма было разагнуць, што высокая сустрэчная хваля накрывала амаль з галавой.

Гэта, магчыма, змова дужых, загартаваных, мужных людзей.

Жаданне падарожнічаць на байдарках—схільнасць душы. І у каго яна ёсць, той ужо не здрадзіць ёй. Магчыма, нельга спасцігнуць гэта з сушы — трэба самому лезці у байдарку.

**О. ОЛЬГІНА.**





Фота В. Мираненкі, У. Гумінскага, С. Максіменкі, А. Піатроускага.

# ШТО ТАКОЕ СПАРТЫЎНАЕ АРЫЕНТАВАННЕ

Арыентаванне — сучасны від спорту. Адзін з тых, чыя папулярнасць у апошні час імкліва расце, і які значна адрозніваецца ад іншых відау спорту. Дык што ж такое арыентаванне?

Уявіце сабе лес, які цягнецца далёка за гарызонт, а на ўзлеску шуміць і хвалюецца стракаты натоуп арыенціроушчыкау і балельшчыкау. Чырвонае палотнішча «старт»—і праз хвіліну зрываюцца з лініі і знікаюць у лесе спартсмены.

Падыходзіць ваша чарга. Атрымліваеце падрабязную карту мясцовасці (маштаб 1:20 000) з абазначанымі на ёй кантрольнымі пунктамі (КП), якія вам неабходна адшукаць. Арыентуеце карту ў паўночным напрамку па компасу, апошнія секунды і ... марш!

Як страла, вы накіроуваецеся да першага КП.

Але чамусьці з першых крокау ужо пачынае адольваць сумненне: ці туды я бягу, бо спартсмены, якія стартавалі перада мною, накіраваліся у другі бок? Але у гэтым і заключаецца уся прыгажосць арыентавання. Кожны удзельнік выбірае свой, абдуманы у лічаныя секунды шлях.

Такім чынам, ваш шлях (магчыма, і верны) ляжыць па дарогах і сцяжынках, блукае па узгорках і долах, скача праз ручай, паузе па балоту, прадзіраецца праз густы маладняк лесу. Часам ен перасякаецца са шляхам вашага саперніка, і тады чуецца сапенне і трэск сучкоу у некалькіх кроках.

Але вы няумольна рухаецеся далей, дзе у абход, дзе напрамік, нарэшце... Вось яна, мэта — чырвонабелая прызма — КП!

З хуткасцю маланкі робіце адзнаку КП кампосцерам на карце і, як прывід, знікаеце, каб не навесці на «след» сапернікау.

Ну вось, дыстанцыя пройдзена. Набегаушыся, добра паблукаушы, але усё-такі знайшоушы усе КП, вы вяртаецеся на фініш.

Здаеце карту і цікавіцеся, колькі часу пайшло на пошук (чым менш, тым бліжэй да першага месца), падтрымліваемыя клапатлівымі рукамі, ідзеце да бівуака сваей секцыі. Тут пачынаецца абмен думкамі наконт лепшага (і найбольш эфектыунага) шляху, абмяркоуваюцца памылкі. А калі усе вярнуліся да фінішу — невялікія зборы — і дадому. Доуга яшчэ будзе успамінацца гэта паездка за горад.

Аднак трэба памятаць, што усё гэта — для спорту, гонару каманды і усяго калектыву. Таму калі вас цікавіць перш за усё спорт, калі вы хочаце навучыцца бегаць і думаць хутка, калі вас прыцягвае рамантыка лесу — запрашаем у секцыю арыентавання.

**У. ГУМІНСКІ,**
**А. ШПАКОЎСКІ,**
Фота У. Гумінскага.





«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём—1,5, друк. ар. АТ 00571 Заказ № 1723.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.